5. Актыўны ўдзел камсамольскіх арганізацый у асваенні новых форм гаспадарання стаў своеасаблівай "школай новай эканомікі", якая ў наступныя гады спрыяла з'яўленню новай генерацыі сучасных кіраўнікоў.

Пры далейшым развіцці тэмы неабходна пашырыць спектр архіўных і статыстычных даных. Праблематыка тэмы, яе недастатковае асвятленне ў гістарыяграфіі падкрэсліваюць неабходнасць далейшых даследаванняў з мэтай прааналізаваць лакальную спецыфіку перабудовы камсамольскіх арганізацый.

**Літаратура:**


1. Постановление Совета Министров СССР от 04.08.1988 № 956 «О содействии в хозяйственной деятельности ВЛКСМ» [Электронный ресурс] // Информационный портал СССР. – Режим доступа: http://sssr.regnews.org/doc/xq/sm.htm. – Дата доступа: 05.01.2019.
2. Постановление Совета Министров СССР, ВЦСПС и ЦК ВКЛСМ от 13.03.1987 №321 «Об образовании Всесоюзного координационного совета научно-технического творчества молодежи и оплате труда членов творческих молодежных коллективов и штатных работников центров научно-технического творчества молодежи» [Электронный ресурс] // Информационный портал СССР. – Режим доступа: http://sssr.regnews.org/doc/zq/sw.htm. – Дата доступа: 05.01.2019.
3. «Комсомольская экономика» и генезис бизнес-элиты [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://oplib.ru/finansi/view/1136603_komsomol_skaya_ekonomika_i_genezis_biznes_elity. – Дата доступа: 05.01.2019.
4. «Об утверждении Положения о молодёжном центре при ГК ЛКСМБ» // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 42. Д. 3. Л. 3.
5. «Об утверждении Устава молодёжного жилого комплекса завода «Измеритель» // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 42. Д. 3. Л. 5.
6. Доклад первого секретаря Новополоцкого ГК ЛКСМБ С.И. Дроздовой на XI городской отчётно-выборной комсомольской конференции // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 38. Д.16. Л. 10-24.
7. Доклад первого секретаря Новополоцкого горкома КПБ В.В. Панталёва «О взаимодействии партийных комитетов с комитетами комсомола, городским Советом народных депутатов, государственными предприятиями и учреждениями по решению социальных, духовных проблем молодежи в современных условиях» на IV совместном Пленуме ГК КПБ и ГК ЛКСМБ // ГАВО. Ф. 9801-П. Оп. 39. Д. 1. Л. 31-46.
8. Козлов, А.С. Особенности политической ситуации в Новополоцке в марте 1990 – августе 1991 г. / А.С. Козлов // XII Машеровские чтения: материалы Международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых учёных, Витебск, 19 октября 2018 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: И.М. Прищепа (гл. ред.) [и др.] – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2018. – С. 95–96.
9. Перспективный план работы городского центра НТТиДМ за 2-е полугодие 1988 года // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 40. Д. 3. Л. 161.
10. Положение о молодёжном центре при ГК ЛКСМБ // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 40. Д. 3. Л. 12-24.
11. Положение о проведении городского фестиваля «Рок-кола-91» в память музыканта группы «Сталкер» Александра «Алекса Дзвінскага» Желдакова // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 43. Д. 2. Л. 34.
12. Постановление IV совместного Пленума ГК КПБ и ГК ЛКСМБ «Об утверждении программы взаимодействия городских партийной и комсомольской организаций» // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 43. Д. 2. Л. 61–62.
13. Программа взаимодействия городских партийной и комсомольской организаций // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 43. Д. 2. Л. 63–65.
14. Проект программы «Молодёжь» // Химик: орган Новополоцкого горкома КП Белоруссии и городского Совета народных депутатов. – 1990. – 22 сент. – С. 2.
15. Решение бюро Новополоцкого горкома ЛКСМБ о создании молодёжной газеты «Местное время» // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 43 Д. 2. Л. 3.
16. Устав газеты «Местное время» // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 43. Д. 2. Л. 7-12.
17. Устав молодежного жилого комплекса завода «Измеритель» // ГАВО. Ф. 9709-П. Оп. 42. Д. 3. Л. 25–33.
18. Шлеймович, М.М. Новополоцк: год за годом: история, архитектура, строительство / М.М. Шлеймович. – Мн.: Беларусь, 2008. – 439 с.



УДК 008.323.15(476) "1920"


# НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА БССР У 1920-х гг. І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЦІ


**Каляда І. У.**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
(г. Мінск, Беларусь)



Анатацыя. У артыкуле разглядаецца такі накірунак палітыкі беларусізацыі, як адносіны да культуры нацыянальных меншасцей, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі. Іх развіццё падтрымлівалася, забяспечвалася арганізацыйна і матэрыяльна: для іх стваралася сістэма экстэрытарыяльнай аўтаноміі, магчымасць навучання дзяцей на роднай мове, вызначаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця літаратуры, тэатральнага мастацтва.



Ключавыя словы: палітыка беларусізацыі, нацыянальныя меншасці, адукацыя, літаратура, тэатральнае мастацтва.



Summary. The article deals with such direction Belarusization policy as related to national culture of the minorities in the territory of Belarus. Their development sponsor, organizationally and financially: they created a system of extraterritorial autonomy, the ability to teach children in their native language, determined by the favorable conditions for the development of literature, theater.



Keywords: politics Belarusization, minorities, education, literature, theater.


1920-я гады ў гісторыі нашай краіны вядомыя як перыяд адраджэння, росквіту перш за ўсё беларускай культуры і мовы. Гэта быў час правядзення беларусізацыі – палітыкі нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Свой афіцыйны статус як дзяржаўнай палітыкі беларусізацыя атрымала з прыняццем на ІІ сесіі ЦВК БССР (ліпень 1924 г.) пастановы "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі" і рэзалюцыі пленуму ЦК КП(б)Б (ліпень 1924 г.) "Аб праграме работ па правядзенні нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі", згодна з якімі раўнапраўнымі на тэрыторыі Беларусі абвяшчаліся беларуская, руская, яўрэйская і польская мовы. Вызначаныя ў пастановах меры па беларусізацыі адкрывалі шырокія магчымасці для ажыццяўлення ідэй беларускага адраджэння, адначасова даволі поўна ўлічвалі асаблівасці ўмоў на Беларусі: нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва, нізкі ўзровень эканамічнага развіцця краіны і інш. Пры распрацоўцы і ажыццяўленні беларусізацыі неабходна было ўлічваць і шматнацыянальны склад насельніцтва Беларусі, яго своеасаблівае рассяленне па тэрыторыі рэспублікі. Так, згодна з перапісам 1926 г. пасля другога ўзбуйнення БССР доля беларусаў у агульным складзе насельніцтва налічвала 80,6% (1922 г. – 74,8%), яўрэяў – 8,2, рускіх – 7,7, палякаў – 2, украінцаў – 0,7, латышоў – 0,3, літоўцаў, немцаў, татараў – па 0,1, усіх іншых – 0,2% [2, с. 60]. Як бачна, яўрэі, рускія, палякі з'яўляліся найбольш вялікімі па колькасці нацыянальнымі меншасцямі.

Беларусы галоўным чынам пражывалі ў вёсках, яўрэі з прычыны існаваўшай пры царызме рысы аседласці, канцэнтраваліся ў мястэчках і гарадах, складаючы часам да 40–60% колькасці іх жыхароў. У гарадах большай часткай пражывалі рускія, хаця нямала іх было і ў сёлах. Астатнія нацыянальныя меншасці жылі як у гарадах, так і ў вёсках, утвараючы нярэдка даволі кампактныя групы. Такое рассяленне стварала своеасаблівы нацыянальны разрыў паміж горадам і вёскай, а таксама ўносіла спецыфіку ў моўнае становішча – рускамоўны горад і беларускамоўная вёска. Правядзенне нацыянальнай палітыкі ўскладнялася яшчэ і тым, што нацыянальныя і сацыяльныя адметнасці з прычыны гістарычных, гаспадарчых і палітычных умоў цесна перапляталіся паміж сабою. Яўрэі разглядаліся беларускім сялянствам, галоўным чынам, як насельніцтва ў большай меры гандлёвае, няздольнае да прадукцыйнай працы (хаця значная частка яўрэяў займалася саматужнымі рамёствамі і працавала на фабрыках і заводах у якасці рабочых).

Інтарэсы нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, не засталіся без увагі, што стала характэрнай рысай беларусізацыі. Адносіны да іх мовы і культуры былі аналагічнымі адносінам да беларускай мовы і культуры. Іх развіццё падтрымлівалася, забяспечвалася матэрыяльна і арганізацыйна. І, дзякуючы гэтаму, з боку прадстаўнікоў некарэннай нацыянальнасці не назіралася якіх-небудзь сур'ёзных пярэчанняў, супраціўлення такой палітыцы. Больш таго, беларусізацыя 1920-х гадоў дала багата прыкладаў плённай працы прадстаўнікоў рускай, польскай, яўрэйскай, украінскай і іншых нацыянальнасцей на ніве беларускай культуры.

Адзначым тое, што для гэтых народаў стваралася сістэма так званай экстэрытарыяльнай аўтаноміі, якая прадугледжвала арганізацыю сельскіх і гарадскіх нацыянальных Саветаў там, дзе жыло больш за 500 прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальнасці. Упершыню пра неабходнасць арганізацыі падобных нацыянальных адзінак на Беларусі было сказана на ІІ сесіі ЦВК БССР VI склікання і на ліпеньскім (1924 г.) Пленуме ЦК КП(б)Б. У рашэннях Пленума адзначалася, што неабходна забяспечыць магчымасць выдзялення ў самастойныя адміністрацыйныя адзінкі

валасцей і сельскіх грамадстваў з пераважаючым яўрэйскім, латышскім і літоўскім насельніцтвам пры ўмове, што гэта не будзе рэзка парушаць асновы і сістэму новага адміністрацыйна-гаспадарчага падзелу.

І калі ў 1924 г. у Беларусі існавала ўсяго 9 нацыянальных Саветаў (7 яўрэйскіх і 2 латышскіх), то ў 1929 г. – 67 (23 яўрэйскіх, 19 польскіх, 16 расійскіх, 5 латышскіх, 2 украінскіх і 2 нямецкіх) [1, с. 32]. Для больш чым 10 тысяч прадстаўнікоў гэтых народаў ствараліся нацыянальныя раёны, на тэрыторыі якіх ажыццяўлялася свая мінікарэнізацыя і мінінацыяналізацыя. Напрыклад, такі раён быў створаны недалёка ад Мінска з цэнтрам у мястэчку Койданава (Польскі нацыянальны раён імя Ф. Дзяржынскага).

Склад нацыянальных Саветаў забяспечваў абслугоўванне ўсіх нацыянальнасцей, бо гэтыя Саветы арганізоўваліся па нацыянальна-тэрытарыяльным прынцыпе. У іх склад уваходзіла насельніцтва ўсіх нацыянальнасцей, пражываючых на тэрыторыі адпаведнага нацыянальнага Савета.

Пры арганізацыі нацыянальных Саветаў галоўнай мэтай ставілася пераадоленне міжнацыянальных варожых адносін. Да таго ж дзейнасць нацсаветаў садзейнічала гаспадарчаму ўздыму, развіццю кааперацыі, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, павышэнню культурнага ўзроўню. Разам з тым у рабоце Саветаў назіраліся сур'ёзныя недахопы і адмоўныя моманты. У шматлікіх партыйных і савецкіх дакументах, запісках, дасланых у ЦВК БССР, адзначалася, што ў некаторых мясцінах пры арганізацыі нацыянальных Саветаў увасабляліся выключна нацыянальныя прынцыпы без уліку тэрытарыяльных. Былі выпадкі, калі яўрэйскія местачковыя Саветы абслугоўвалі толькі яўрэйскае насельніцтва, а ўсе астатнія, хто пражываў на тэрыторыі гэтага Савета, вымушаны былі звяртацца ў сельскі савет, размешчаны даволі далёка (напрыклад, так было ў Мазырскай акрузе).

Вядома, такая арганізацыя не садзейнічала ўзаемаразуменню між нацыянальнасцямі, часам прыводзіла да палітычных, сацыяльных супярэчнасцей і канфліктаў ва ўзаемаадносінах паміж рознымі нацыянальнымі супольнасцямі.

У комплексе распрацаваных мерапрыемстваў па беларусізацыі грамадскага жыцця ў рэспубліцы першачарговае значэнне надавалася сістэме народнай адукацыі. Зыходным прынцыпам нацыянальнай палітыкі ў школьнай справе вызначаўся прынцып забеспячэння правоў і магчымасцей кожнай нацыянальнасці, пражываючай на Беларусі, навучаць дзяцей на роднай мове адпаведна іх удзельнай вазе ў агульнай колькасці насельніцтва і жаданню бацькоў. Палітыка беларусізацыі з яе прыярытэтам беларускай мовы і культуры ні ў сваіх гістарычных вытоках, ні ў час свайго найвышэйшага ўзлёту ў 1920-я гады ніколі не несла ў сябе пагардлівых адносін да моў і культур іншых народаў. Наадварот, адносіны да іх былі аналагічнымі адносінам да беларускай мовы і беларускай культуры. Побач з беларускімі адчыняліся школы і класы з роднай мовай выкладання для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей – рускай, яўрэйскай, польскай, украінскай і інш.

Да рэвалюцыі, як вядома, усе нацыянальныя меншасці, як і беларусы (акрамя рускіх), знаходзіліся пад царскім уціскам. Русіфікатарская палітыка не давала магчымасці развівацца мовам нацыянальных меншасцей. На Беларусі амаль не было дзяржаўных яўрэйскіх школ, забаранялася навучанне ў школах на польскай мове. Заняткі ў гарадскіх яўрэйскіх прагімназіях, прыватных гімназіях і рэальных вучылішчах праводзіліся на рускай мове. Дзеці ж палякаў маглі вучыцца польскай мове толькі ў так званых тайных (нелегальных) школах.

Падчас правядзення палітыкі беларусізацыі ў яўрэйскага і польскага насельніцтва з'явілася магчымасць карыстацца роднай мовай у школах і дзяржаўных установах. Хутка развівалася сетка яўрэйскіх школ. Калі ў 1924/25 навучальным годзе ў БССР дзейнічала 87 пачатковых і 42 сямігадовыя яўрэйскія школы з ахопам да 19 тыс. вучняў, то ўжо ў 1926/27 навучальным годзе колькасць пачатковых школ павялічылася да 132–147, а сямігадовых – да 50–53, што складала адпаведна 3 і 18 працэнтаў ад агульнай колькасці такіх школ у рэспубліцы. Агульная колькасць вучняў складала больш за 24 тысячы чалавек [5, с. 254]. Адкрыццё школ садзейнічала павелічэнню ахопу навучаннем дзяцей яўрэйскай нацыянальнасці.

У той жа час неабходна адзначыць, што ў пачатку 1920-х гг. у рэспубліцы былі забаронены ўсе ўстановы традыцыйна-рэлігіёзнай яўрэйскай адукацыі. Яшчэ ў верасні 1921 г. было прынята рашэнне Наркамасветы БССР аб закрыцці хэдэраў (прыватных яўрэйскіх школ) і пераўтварэнні іх у "совшколы". Гэта была цэлая кампанія, якая суправаджалася моцнай агітацыяй – сходамі яўрэяў-камуністаў, мітынгамі і іншымі мерапрыемствамі. Падобныя абставіны прыводзілі ў асобных выпадках да адасаблення часткі яўрэяў і нават узнікнення антысавецкіх настрояў.

Работа па арганізацыі польскіх школ праходзіла больш складана ў сувязі з распыленасцю пражывання польскага насельніцтва. Тут ствараліся аднакамплектныя школы. Але мелі месца выпадкі, калі яны адкрываліся сярод беларусаў-католікаў, якія не заўсёды жадалі вывучаць польскую мову.

У выніку абмеркавання пытання аб школьным будаўніцтве сярод гэтай катэгорыі насельніцтва ў жніўні 1925 г. было прынята рашэнне аб паступовым пераводзе школ, якія абслугоўвалі беларусаў-католікаў, на беларускую мову, пры гэтым намячалася пакінуць польскую мову як абавязковы прадмет навучання. Калі ў 1925/26 навучальным годзе ў БССР налічвалася 98 польскіх школ, то ў 1926/27 – 138 [5, с. 254]. Акрамя польскіх школ, меліся беларускія школы з выкладаннем польскай мовы.

У 1925/26 навучальным годзе адчынілі дзверы першыя дзве літоўскія школы ў Полацкай акрузе. У 1927 г. іх было 10.

Наогул, у 1927 г. выкладанне ў школах Беларусі вялося на васьмі нацыянальных мовах.

Працэнт нацыянальных школ адпавядаў колькасці насельніцтва асобнай нацыянальнасці, за выключэннем яўрэйскіх і часткова рускіх (4-гадовых) школ. Неадпаведнасць у адносінах школ на яўрэйскай мове тлумачыцца, галоўным чынам, імкненнем яўрэйскага насельніцтва пасылаць сваіх дзяцей у беларускія і рускія школы; у адносінах рускіх школ тлумачыцца тым, што 4-гадовыя школы знаходзіліся ў сельскай мясцовасці. Рускае гарадское насельніцтва абслугоўвалася 7-гадовымі працоўнымі школамі на рускай мове ў аднолькавай меры з іншымі нацыянальнасцямі.

У грамадстве у цэлым, як ужо адзначалася, былі даволі прыхільныя адносіны да кампаніі, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі. Але выказваліся думкі аб тым, што, напрыклад, рускія школы на Беларусі наогул не патрэбны, таму што "не хапае ні патрэбных кніг і навуковых прылад, ні належных настаўнікаў", а калі на Беларусі і павінна існаваць рабоча-сялянская школа, то гэта "можа быць школа пераважна беларуская і толькі за нязначным выключэннем – яўрэйская ці польская, але ніяк не расійская..." [6, с. 94].

У асобных выпадках назіраўся рэзкі кантраст паміж памяшканнямі і абсталяваннем, напрыклад, яўрэйскай і беларускай школы ў адной мясцовасці. Гэта прыводзіла да таго, што яўрэйская школа дадзенай мясцовасці разглядалася як школа другога гатунку і спрыяла адтоку вучняў з гэтай школы ў беларускія ці рускія школы.

Зразумела, што падобныя парадоксы выклікалі незадаволенасць часткі рускамоўнага насельніцтва, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

У перыяд ажыццяўлення беларусізацыі адной з самых вострых была праблема адукаваных кадраў. А станаўленне сеткі адукацыі нацыянальных меншасцей патрабавала хуткай падрыхтоўкі адпаведных педагагічных кадраў. Першы нацыянальны яўрэйскі педтэхнікум быў адкрыты ўжо ў 1921 г. У 1926/27 навучальным годзе працавала тры такіх тэхнікумы – у Мінску, Віцебску і Гомелі (493 навучэнцы). Акрамя таго, у 1926 г. у Мінску пачалі працаваць двухгадовыя яўрэйскія педкурсы, разлічаныя на 50 слухачоў.

Для падрыхтоўкі настаўнікаў польскіх школ у 1923 г. у Мінску адкрыўся польскі педагагічны тэхнікум, у якім дзейнічала завочнае аддзяленне. Аднак ён забяспечваў школы настаўнікамі толькі на 35–40%, таму ў 1926 г. пры тэхнікуме пачалі працаваць двухгадовыя курсы, слухачамі якіх з'яўляліся 42 чалавекі. Акрамя таго, з сакавіка 1928 г. Наркамат асветы БССР стаў пасылаць жадаючых на аднагадовыя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў для польскіх школ, якія дзейнічалі ў Кіеве. Таксама ў Кіеве пры польскім тэхнікуме праводзіўся аднагадовы педагагічны семінар, пасля заканчэння якога слухачы атрымлівалі кваліфікацыю выкладчыка адпаведных дысцыплін у польскіх школах.

Улічваючы невялікую колькасць латышскіх і літоўскіх школ, было немэтазгодным адчыняць педагагічныя тэхнікумы па вывучэнні гэтых моў. Для падрыхтоўкі латышскіх настаўнікаў Наркамасветы штогод пасылаў у Ленінградскі латышскі педтэхнікум па 10 стыпендыятаў.

Кадры настаўнікаў для школ нацыянальных меншасцей рыхтаваў таксама Камуністычны ўніверсітэт народаў Захаду ў Маскве.

З мэтай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў 1924 г. пры яўрэйскім аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ стала працаваць школа, дзе студэнты маглі праходзіць педагагічную практыку, а ў 1926 г. была адкрыта яўрэйская секцыя для падрыхтоўкі студэнтаў, паступаючых на яўрэйскае аддзяленне педфака. Трэба зазначыць, што дзейнасць яўрэйскага аддзялення з кожным годам набывала моц, больш грунтоўнымі станавіліся вучэбныя праграмы, павышаўся ўзровень выкладання. Так, усе вучэбныя планы і праграмы аддзялення ў 1925/26 навучальным годзе былі падрыхтаваны на яўрэйскай мове. У значнай ступені павялічылася колькасць канкрэтна яўрэйскіх прадметаў, да 45% усіх дысцыплін выкладалася на старажытнаяўрэйскай мове. Былі распрацаваны і чыталіся паглыбленыя курсы, асабліва па яўрэйскай гісторыі і філалогіі (“Гісторыя яўрэяў Літвы, Украіны і Беларусі”, “Гісторыя яўрэйскай адукацыі” і інш.). На вывучэнне роднай мовы адводзілася 4-6 гадзін у тыдзень.

Пры педфаку БДУ працавала таксама і польская секцыя, дзе была створана кафедра польскай мовы.

У 1920-я гады вялікую ролю ў навукова-культурным жыцці Беларусі адыграў Інстытут беларускай культуры, які стаў асяродкам беларускай навукова-культурнай і грамадскай думкі. Разам з тым зазначым, што ў яго складзе працавалі чатыры нацыянальныя аддзелы – яўрэйскі, польскі, літоўскі і латышскі, якія вялі навуковыя даследаванні мовы, гісторыі, этнаграфіі, культуры асобных нацыянальнасцей.

У 1929 г. на базе Інбелкульта была ўтворана Акадэмія навук БССР, пры якой для распрацоўкі навуковых і культурных праблем, звязаных з асаблівасцямі тых ці іншых нацыянальнасцей, былі арганізаваны яўрэйская, польская і латышская секцыі. Напрыклад, яўрэйская секцыя мела ў сваім складзе лінгвістычную, літаратурную, сацыяльна-эканамічную і фальклорную камісіі, якія распрацоўвалі пытанні па гісторыі яўрэяў у Беларусі і Літве, па гісторыі каланізацыі, рэкруччыне і інш.

Яшчэ адной складанай праблемай было забеспячэнне неабходнай літаратурай, падручнікамі, выданне часопісаў, што было звязана з надзвычайнай адсталасцю друкарскай тэхнікі (у 1929 г. у друкарнях Белдзяржвыдавецтва 80% усіх працэсаў ажыццяўлялася ручным спосабам).

Разам з тым наркам асветы А.В. Баліцкі, выступаючы з дакладам на VIII Усебеларускім з’ездзе Саветаў у 1927 г., адзначыў, што, нягледзячы на такое становішча, “падручнікамі і літаратурай культурна-асветніцкія ўстановы, абслугоўваючыя нацыянальныя меншасці, задавальняюцца не ў меншай меры, чым культурна-асветніцкія ўстановы, абслугоўваючыя беларускае насельніцтва” [3, с. 29]. Калі ў 1924–1925 гг. Белдзяржвыдавецтва выдавала кнігі на чатырох мовах – беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай, то ў 1927–1928 гг. – ужо на шасці (яшчэ літоўскай і латышскай). Акрамя таго, падручнікі для літоўскіх школ выпісваліся з Літвы, літаратура на латышскай мове друкавалася ў Маскве, у латышскім выдавецтве “Праметэй”. На Беларусі працавала польскае выдавецтва “Культура”, да таго ж польская літаратура набывалася яшчэ і ў Польшчы.

Шырокая праца вялася па вывучэнні попыту на кнігі, для чаго ў кожнай акрузе вылучаліся спецыяльныя лаўкі, а ў Мінску пры Цэнтральным доме селяніна быў арганізаваны спецыяльны кіёск. Прасоўванне кнігі лічылася не толькі вялікай культурнай справай, але і важнай палітычнай працай, што дапамагала правядзенню нацыянальнай палітыкі. Таму ўсім агентам аддзялення “Кніга – вёсцы” рэкамендавалася ўважліва прыслухоўвацца да запатрабаванняў чытача, паведамляць аб тым, якая тэматыка больш цікавіць спажыўца і г.д. Першачарговай задачай лічылася прасоўванне кніг не толькі на беларускай мове, але і на іншых нацыянальных мовах народаў БССР. Таму пры Белдзяржвыдавецтве пачалі дзейнічаць рускія аддзелы, дзе прадавалася рускамоўная літаратура, якая завозілася з Расіі.

Распаўсюджваннем літаратуры на яўрэйскай мове займалася спецыяльнае аддзяленне “Школа і кніга”, якое ў 1927 г. мела два магазіны ў Мінску і восем – у акруговых гарадах. Яно цесна супрацоўнічала з яўрэйскімі культработнікамі, настаўнікамі, школамі. Акрамя таго, яўрэйскія кнігі прадаваліся і праз яўрэйскія аддзелы Белдзяржвыдавецтва, адчыненыя ў перыферыйных крамах. У 1927 г. на мовах нацыянальных меншасцей выдаваліся газеты і часопісы: на польскай мове – газета “Орка”, на рускай – “Рабочий”, “Заря Запада”, “Полесская правда”, на яўрэйскай – газета “Акцябр”, для моладзі – “Юнгер-Арбайтэр”, часопіс “Штэрн”, на літоўскай мове – газета “Чырвоны араты”. Наогул, у 1928 г. з 17 рэспубліканскіх газет 9 выходзілі на беларускай мове, 4 – на рускай, 2 – на польскай, 1 – на яўрэйскай і 1 – на літоўскай [1, с. 29–30].

У 1923 г. у Мінску была ўтворана яўрэйская літаратурная група “Юнгер Арбайтэр” (“Малады рабочы”), якая працавала ў двух напрамках: навучанне і грамадская праца сярод рабочых і моладзі (праводзілі адкрытыя вечары ў рабочых клубах, выязджалі ў мястэчкі). Былі арганізаваны літаратурныя гурткі ў Мінску, Віцебску, Полацку. У 1928 г. група ўлілася ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў у якасці нацыянальнай секцыі. Акрамя гэтай, асацыяцыя мела рускую, польскую і літоўскую секцыі.

Разам з літаратурай набірала моц і нацыянальнае тэатральнае мастацтва. У 1929 г. на Беларусі працавалі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр, Яўрэйскі і Польскі вандроўныя тэатры, шматлікія студыі і самадзейныя тэатральныя калектывы. Цікава адзначыць, што ў плане работы, напрыклад, Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра былі такія пункты, як “укараненне яўрэйскай мовы як у размовах, так і ў вывучэнні гісторыі і літаратуры” і разам з тым “вывучэнне гісторыі беларускай культуры і мовы ў першую чаргу сярод акцёраў” [4, с. 78]. Падобная праца вялася і ва ўсіх іншых нацыянальных тэатрах, што сведчыць пра тое, што развіццё тэатральнага мастацтва ў 1920-я гады ішло ў агульным напрамку беларусізацыі. У гэты перыяд выпрацоўваліся суадносіны класічнага рэпертуару і тагачасных сцэнічных твораў, з улікам папярэдніх театральных традыцый закладваліся асновы новых, ішоў пошук удасканалення прафесійнага майстэрства адпаведна задачам стварэння новага грамадства.

Такім чынам, пры распрацоўцы і ажыццяўленні беларусізацыі значная ўвага надавалася таму, каб на тэрыторыі Беларусі мелі магчымасць развіваць сваю мову і культуру і прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Беларусізацыя, ставячы сваёй галоўнай мэтай развіццё беларускай мовы і культуры, традыцый беларускага народа, ніколі не несла ў сабе пагардлівых адносін да мовы і культуры народаў іншых нацыянальнасцей. Наадварот, адносіны з імі будаваліся так, каб развівалася не толькі сваё, беларускае, але і тое, што належала рускай, польскай, яўрэйскай і іншым нацыянальнасцям. Такія кантакты вялі да ўзаемаўзбагачэння культур гэтых народаў, што было пажаданым для кожнага з іх, і доўгі час падтрымлівалася як афіцыйнымі ўладамі, так і мастацкай інтэлігенцыяй, шырокімі масамі людзей.

**Літаратура:**

1. Асноўныя вынікі работы ўраду БССР. Да перавыбараў Саветаў. 1928–1929 г. – Менск: Выд-ва ЦВК і СНК БССР, 1928. – 150 с.
2. Будзін, Ш.А. Нацыянальнае пытанне / Ш.А. Будзін. – Менск: Дзяржаўнае выд-ва Беларусі, 1932. – 392 с.
3. Восьмы Усебеларускі з’езд Саветаў. Стэнаграфічная справаздача. – Мінск: Выд-ва ЦВК БССР, 1927. – 486 с.
4. Дунец, Х. Яўрэйскае культурнае будаўніцтва ў БССР / Х. Дунец // Маладняк. – 1929. – № 2. – С. 75–81.
5. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: Экаперспектыва, 1997. – 486 с.
6. Харэвіч, А. Школа і палітыка / А. Харэвіч // Полымя. – 1924. – № 3. – С. 90–96.

УДК 94(476) «1953/1985»

## ПОДГОТОВКА И ОБУЧЕНИЕ КАДРОВ В ОБЛЛИТАХ БССР В 1953–1985 гг.

**Козлов А. А.**
Витебский государственный университет
имени П. М. Машерова
(г. Витебск, Беларусь)